ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
11
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 33 (1519)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
«ЎЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### У «Стайках»

адбылася вучоба камсамольскага актыву Белдзяржуніверсітэта сумесна з МДПІ імя А. М. Горкага і Мінскага медінстытута.

За час вучобы перад камсамольцамі выступілі міністр унутраных спраў БССР В. А. Піскароў, рэктар БДУ імя У. І. Леніна Л. І. Кісялеўскі, партыйныя і камсамольскія работнікі.

У час адпачынку былі праведзены дыскатэкі і КВЗ. Лепшай сярод каманд БДУ была каманда гістарычнага факультэта, якая заняла ў КВЗ трэцяе месца.

А. ПУЦІЛА.

### Лекцыя

аб праблемах палітычнага і эканамічнага характару, аб міжнародным становішчы сучаснай Афрыкі адбылася ў актавай зале аддзялення міжнароднай журналістыкі. Студэнты і выкладчыкі журфака сустрэліся з вядучымі навуковымі супрацоўнікамі АН СССР. Навуковы супрацоўнік Інстытута Афрыкі АН СССР, кандыдат эканамічных навук У. С. Баскін і вучоны сакратар навуковага савета АН СССР па праблемах Афрыкі, кандыдат гістарычных навук Ю. М. Ільін пазнаёмілі прысутных з гісторыяй афрыканскіх краін, расказалі аб іх эканамічных сувязях з сацыялістычнымі краінамі.

Было зададзена шмат пытанняў, на якія атрымалы аргументаваныя адказы.

Г. ШАЎЦОВА.

### Снежань

— пачатак падрыхтоўкі да курсавых і дыпломных работ. Неад'емнай часткай гэтага працэсу з'яўляецца пошук і вывучэнне літаратуры. У ходзе пошуку патрэбнай вам літаратуры можа здарыцца, што некаторыя выданні адсутнічаюць у фондзе нашай бібліятэкі. Тады вам дапаможа служба МБА (міжбібліятэчны абанемент).

Бібліятэка БДУ падтрымлівае цесную сувязь больш як са 100 бібліятэкамі краіны. Выкарыстоўваюцца фонды мясцовых профільных, усесаюзных, рэспубліканскіх, краявых і абласных бібліятэк. Па МБА магчыма заказаць літаратуру з любой бібліятэкі як на рускай, так і на замежных мовах. Можна заказаць копію артыкула з кнігі або часопіса. Але для таго, каб служба МБА працавала эфектыўна, неабходна своечасова звяртацца за дапамогай у даведачна-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі.

С. БАДЗЯЛІК,
адказная па МБА.

...І пяць студэнцкіх гадоў



Выпускны вечар — заўсёды хвалюючы момант. Гэта хвіліны жыцця, якія ніколі не забудуцца, застануцца ў сэрцы, як нешта вельмі дарагое, блізкае...

МАЦАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

## І майстэрства, і натхненне

РАЗВІТАЛЬНЫ вечар пяцікурснікаў юрыдычнага факультэта. У зале шматлюдна, стаіць нейкі асаблівы радасны гоман. А да люстэрка не прабіцца: усе жадаюць быць па-святочнаму прыгожымі. Але прыгажосць была не ў модных сукенках і прычосках. Яна — у бляску вачэй выпускнікоў, што прыйшлі на свой апошні факультэцкі вечар.

Спачатку былі віншаванні. Іх віталі і малодшыя сябры, у прамовах якіх адчувалася добрая зайздрасць тым, хто прайшоў нарэшце праз вялікую колькасць залікаў і экзаменаў і праз кароткі час стане сапраўдным юрыстам; і тыя, хто не аднойчы ўжо даваў слушныя парады на дарогу сваім выхаванцам.

А потым было цікавае гумарыстычнае выступленне факультэцкага тэатра мініяцюр «Верасень».

У зале цішыня, паўзмрок. А на сцэне — кіпучае жыццё. Лёс выпускніка юрфака стаў галоўнай тэмай выступлення. Эмацыянальна і даволі прафесійна ігралі студэнты другога курса. Я. Лазарэнкаў, Т. Навумовіч, Т. Станкевіч, А. Бурдыка і іншыя. На сцэне было ўсё: праўда спалучалася з выдумкай, гумар — з сур'ёзным паказам будняў супрацоўнікаў аховы правапарадку.

Трэба сказаць, што студэнты трымалі ў сакрэце ад пяцікурснікаў праграму вечара, і для віноўнікаў урачыстасці ўсё, што адбывалася, было нечаканасцю.

— У нас такая традыцыя — пяты курс не ўдзельнічае ў пастаноўках «Верасня». Таму мы вельмі хваляваліся за нашых малодшых сяброў. Але яны малайцы. Прыемна адчуваць, што тэатр мініяцюр жыве, дзейнічае. Нават без нас,— падзяліліся думкамі студэнткі V курса А. Лебедзева і А. Гарбар.— Але сумна трохі ад гэтага: ужо без нас...

І сапраўды сумна: апошні студэнцкі вечар, апошняя сустрэча з родным «Вераснем». Былі нават слёзы. Ужо пасля прадстаўлення нехта прызнаўся:

— Сыравата было за кулісамі... Гэта былі слёзы суму і разам з тым радасці. Бо гэта для іх апошні вечар. А для першакурснікаў ён першы. Яны — іх працяг.

І як апошні акорд да вечара — выступленне тых, дзеля каго сабраліся студэнты, выкладчыкі, госці.

В. Ракіцкі, А. Лебедзева, А. Гарбар, Т. Алейнік, І. Коваль і іншыя выпускнікі выказалі вялікую падзяку сваім выкладчыкам за тыя веды, што на працягу пяці гадоў яны давалі ім. А потым студэнты падарылі выкладчыкам песню — успамін пра незабыўныя хвіліны вучобы:

...Нам не забыть своих друзей,
Нам не забыть с тобой вовек
Прекрасных этих лет...

Яркімі агнямі асвяцілася зала. Шчырыя апладысменты — лепшае сведчанне таму, што вечар прайшоў на славу.

К. ЧАПЛЯ,
А. КРАГЕЛЬ,
студэнткі факультэта журналістыкі.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

З ПЕРАБУДОВАЙ МАРУДЗЯЦЬ

## ЯРЧЭЙ СВЯЦІ, «КП»!

Як вядома, «Камсамольскі пражэктар» з'яўляецца адной з форм удзелу моладзі ў грамадскім кантролі, у барацьбе з праявамі безгаспадарчасці, бюракратызму, парушэнняў дысцыпліны. Задача «КП» — развіваць у юнакоў і дзяўчат грамадскую актыўнасць і непрымірымасць да ўсяго ўстарэлага, адыходзячага.

ВА ЎМОВАХ перабудовы неабходна павышаць дзейснасць работы «КП», не марудзячы асвойваць новыя формы і метады дзейнасці. У сувязі з гэтым важнае месца займае галоснасць, г. зн. аператыўнае асвятленне працы пражэктарыстаў, інфармаванне аб прынятых мерах па ліквідацыі недахопаў, прапаганда перадавога вопыту.

Трэба прызнаць, што «КП» яшчэ недастаткова інфармуе камсамольцаў пра тую работу, якая праводзіцца ва універсітэце, слаба выкарыстоўваюцца магчымасці «Маланак», «Баявых лісткоў», насценак, агітбрыгад, шматтыражкі «Беларускі універсітэт». Найважнейшыя пытанні, вывады і прапановы неабходна выносіць на абмеркаванне камсамольскіх сходаў.

Галоўнай мэтай шырокай галоснасці ў працы штабоў і пастоў «КП» з'яўляецца не толькі грамадскае асуджэнне канкрэтных вінаўнікаў тых або іншых недахопаў, але і прадухіленне падобных памылак у будучым. Таму нумары «КП», адлюстроўваючы найбольш надзённыя праблемы, павінны не толькі смела крытыкаваць недахопы, але і абавязкова прапаноўваць неабходныя захады па іх ліквідацыі. На жаль, і сёння ў органах друку шэрагу штабоў «КП» БДУ няма глыбокага зместу, адсутнічаюць цікавыя рубрыкі і матэрыялы. Відавочна, што іх узровень не адпавядае патрабаванням часу.

Досыць часта назіраюцца зняважлівыя адносіны да сатыры і гумару, прынцыповая крытыка замяняецца «зубаскальствам», друкуюцца матэрыялы, якія не маюць грамадскай значнасці. І зусім недапушчальным з'яўляецца «голы», пусты стэнд «КП» БДУ, які, на маю думку, няўдала аформлены і размешчаны ў такім месцы, дзе на яго ніхто не звяртае ўвагі. Газеце пражэктарыстаў павінна быць вылучана цэнтральнае месца сярод усёй нагляднай агітацыі. Неабходна ў кароткі тэрмін ліквідаваць негатыўныя факты ў рабоце «КП», узняць яе на новы якасны ўзровень. І рабіць гэта трэба самым рашучым чынам, не адкладваючы на заўтра. «КП» універсітэта павінен не толькі каардынаваць працу штабоў і пастоў, але і абагульняць перадавы вопыт, аказваць дапамогу, быць лідэрам у перабудове.

Ю. ПОЗНЯК,
член штаба «КП» універсітэта,
старшыня штаба «КП» супрацоўнікаў і выкладчыкаў,
асістэнт мехмата.

## НЕТРАДЫЦЫЙНЫ ЗЛЁТ

# І ЗНОЎ ЛЕТА-86

*ЗДЗІЎЛЕННЕ чакала тых, хто прыйшоў у мінулую нядзелю паабедаць у рэстаран «Журавінка». Традыцыйнай шыльдачкі ў такіх выпадках «Спецабслугоўванне» не было, але...*

*У гэты дзень памяшканне рэстарана было аддадзена ў распараджэнне... студэнтаў. Праходзіў злёт байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў Мінскай вобласці. Без звычайных сумных дакладаў за трыбункай. А весела і цікава, з танцамі і песнямі, з жартамі і смачнымі стравамі. Здавалася, што на беразе Свіслачы сабралася адна вялікая, дружная кампанія моладзі, і ніхто ў ёй не адчуваў сябе лішнім, непатрэбным.*

*Шмат знаёмых твараў мы ўбачылі тут. І не дзіўна. На сустрэчу прыйшлі будатрады «Рытм» і «Ветразь», «Стэлуца» і «Мара». Міні-інтэрв'ю давалі старшы выкладчык Прыгодзіч Мікалай Рыгоравіч, які на працягу шасці гадоў бязменна працуе ў Клецкім занальным штабе; намеснік сакратара парткома Прокашава Вера Акімаўна. Іменна з яе прозвішчам цесна звязана праца беларускіх атрадаў у Малдаўскай ССР. А яшчэ пра Веру Акімаўну гавораць, што патрэбны глобус, каб расказаць аб яе будатрадаўскай біяграфіі.*

*Праграма злёту была настолькі разнастайнай і насычанай, што немагчыма аб усім расказаць. Тут жа было вырашана, што такія сустрэчы будуць праводзіцца не раз у пяць гадоў, як раней, а штогод, і не толькі ў такіх маштабах. Пасля заканчэння злёту былы начальнік штаба працоўных спраў БДУ Ігар Вярэнчыкаў выказаў пажаданне абавязкова правесці такую ж сустрэчу ва універсітэце. І гэта вельмі правільна. Таму што сапраўдная сустрэча — гэта не справаздача з сухімі лічбамі і фактамі, а цікавыя расказы сябрам пра сябе, успаміны аб момантах будатрадаўскага лета, гэта — сапраўдны адпачынак.*

*А. ВІХРОВА.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*







## П'ЯНСТВА — ВОН!

**Мінуў год, як у сценах нашага універсітэта арганізавана добраахвотнае таварыства барацьбы за цвярозасць. Асэнсаванне, што цвярозасць — гэта галоўная ўмова агульнай культуры чалавека, яго здароўя і змястоўнага жыцця, усё глыбей пранікае ў кожнага з нас. Зразумела, п'янства яшчэ трывала трымаецца за свае пазіцыі, схавалася па кватэрах і дамах. Але мы ўпэўнены, што будучае — за жыццём цвярозым, што барацьба з гэтым страшэнным злом прывядзе ўсіх нас ад таварыства барацьбы за цвярозасць — да цвярозага ладу жыцця.**

# Ад таварыства — да цвярозага ладу жыцця

А КОЛЬКІ было спачатку размоў, разважанняў, спрэчак! У памяці і цяпер паўстаюць самыя розныя пытанні, якія нам, арганізатарам таварыства ў БДУ, даводзілася час ад часу чуць. Напрыклад, «А што гэта наогул такое, таварыства барацьбы за цвярозасць? Як яго разумець?», «Няўжо цяпер ужо нельга і на Новы год нават бакал шампанскага выпіць?», «А на дзень нараджэння?», «А на вяселлі?». Нярэдка гучалі і такія пытанні-прэтэнзіі: «Што ж мне цяпер, п'яніц трэба будзе лавіць?»

Сёння ў БДУ ўжо створана 20 пярвічных арганізацый таварыства барацьбы за цвярозасць. Колькасць іх членаў складае каля 2 800 чалавек. З іх 895 чалавек прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў, 1896 студэнтаў. Самыя буйныя пярвічныя арганізацыі створаны на факультэце прыкладной матэматыкі (старшыня В. І. Емяльянінаў), радыёфізічным (старшыня М. С. Лазовік), юрыдычным (старшыня В. Ф. Чыгір), біялагічным (старшыня М. В. Кукулянская), фізічным (старшыня Л. Д. Бажко), хімічным (старшыня П. А. Матусевіч), СКТБ (старшыня С. А. Васільеў).

Амаль у кожным падраздзяленні, дзе створаны пярвічныя арганізацыі, афармлены куткі ці стэнды нагляднай агітацыі, ёсць планы работы, праводзіцца шэраг мерапрыемстваў. Пэўны вопыт назапашаны ў фізікаў і журналістаў, разгортваюць у сябе работу хімікі, філолагі (старшыня Я. М. Камароўскі).

Але некаторыя пярвічныя арганізацыі дагэтуль яшчэ ніяк не могуць завяршыць нават чыста арганізацыйны этап работы: гэта гісторыкі (старшыня А. Ф. Ткачук), вельмі слаба, практычна нічога не зроблена сярод кафедраў грамадскіх навук. Хаця іменна гэта падраздзяленне павінна было б узначаліць усю работу сярод калектыву БДУ. Шэраг універсітэцкіх падраздзяленняў наогул «не раскачаліся» стварыць у сябе пярвічныя арганізацыі. Напрыклад, бібліятэка, друкарня, сталовая.

Неабходна ўзмацніць у БДУ арганізацыйную, агітацыйную і прапагандысцкую работу, шырэй паказваць згубныя вынікі алкаголю на духоўнае і інтэлектуальнае развіццё чалавека, яго грамадскую і працоўную актыўнасць. Мы цвёрда ўпэўнены, што членамі таварыства барацьбы за цвярозасць павінны стаць УСЕ студэнты, і пачынаць гэту работу належыць са стварэння зон цвярозасці на факультэтах, курсах, у групах, па месцы жыхарства студэнцкай моладзі — у інтэрнатах. Трэба смела усталёўваць новы тып мыслення, новыя формы правядзення вольнага часу, новыя «цвярозыя» традыцыі.

Першыя ластаўкі такіх новых традыцый у нас ужо ёсць. Зусім нядаўна, 5 верасня, у студэнцкім калектыве БДУ адбылася добрая, слаўная падзея — вяселле! Сапраўднае, безалкагольнае вяселле — радаснае, з гумарам і смехам! І няма сумненняў, што жаніх — Барыс Лысякоў — інструктар камітэта камсамола і нявеста — Наталля Калішчук — студэнтка IV курса факультэта прыкладной матэматыкі на ўсё жыццё запомняць гэты цудоўны, поўны прыгажосці вечар. Шчасця вам, шаноўныя Наталля і Барыс!

Наперадзе ў нас шмат добрых задумак. Ужо арганізаваны ў БДУ пастаянна дзейнічаючы лекторый і кіналекторый: кожную першую сераду месяца ў аўдыторыі № 433 галоўнага корпуса мы збіраемся на чарговае мерапрыемства. У рабоце нашага лекторыя прымаюць удзел лепшыя ў горадзе лектары, якія выступаюць на супрацьалкагольную тэматыку.

У нас ствараецца «банк» перыядычнай інфармацыі, з дапамогай якога нашы акадэмічныя групы змогуць атрымліваць неабходную літаратуру і ўключацца ў актыўную прапагандысцкую работу сярод насельніцтва. Кіруе гэтым участкам прафесар механіка-матэматычнага факультэта А. А. Гусак.

Лепшая альтэрнатыва п'янству — гэта змястоўны, цікавы адпачынак. Таму нашаму таварыству, якое толькі становіцца на ногі, патрэбна яшчэ шмат падумаць у гэтым плане. Такія-сякія крокі мы ўжо робім. Так, з 17 снежня пачне сваю работу для членаў таварыства «Клуб цікавых сустрэч». На першае яго пасяджэнне мы запрасілі вядомага мастацтвазнаўцу, спецыяліста па праблемах сучаснай моладзі і культуры знешняга выгляду, дацэнта тэатральна-мастацкага інстытута М. Ф. Рамашока. Ён раскажа аб гісторыі адзення, прадэманструе слайды, зробленыя ім у Парыжы ў час выстаўкі беларускіх нацыянальных касцюмаў, падзеліцца ўспамінамі аб сустрэчах з Крысціянам Дзіорам.

Г. АЛЯХНОВІЧ,
старшыня добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць БДУ,
прафесар кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў,
доктар эканамічных навук.

## АТАКУЕМ ФАРМАЛІЗМ

**Вялікі маляўнічы плакат: «Запрашаем усіх прыняць удзел у навагодняй латарэі. Разыгрываюцца каштоўныя прызы». Гэта першае, што сустрэла мяне пры ўваходзе ў інтэрнат № 6. У мінулым годзе ён быў аб'яўлены зонай цвярозасці.**

# НІЯКІХ «НЗ» НЯМА

СПАЧАТКУ Я, зразумела, пачала шукаць на дошцы аб'яў запрашэнне на лекцыі, дыспуты, прысвечаныя гэтай надзённай тэме. Хутка прабягаю вачыма сцены вестыбюля ў надзеі адшукаць наглядную агітацыю. Але нічога падобнага не знаходжу.

Гляджу на дзяўчат, якія спяшаюцца на лекцыі. ФПМ — факультэт жаночы. Сустрэць у інтэрнаце хлопца — вялікае шчасце. Суадносіны 9 : 1.

Ці ёсць тут каму наогул парушаць устаноўлены парадак? Міжволі напрошваецца вывад, а ці не ісці гэта па шляху найменшага супраціўлення — аб'яўляць амаль поўнасцю жаночыя інтэрнаты зонай цвярозасці і спыняцца на паўдарозе?

І ўсё роўна, як здорава, што такі вялікі калектыў, інтэрнат цэлага факультэта дружна сказаў «не» спіртному. Захацелася даведацца пра гісторыю гэтага рашэння.

Але тое, што я пачула ад старшыні студсавета Леаніда Галавача і камандзіра аператыўнага атрада Аляксандра Анелькіна, вельмі расчаравала. Аказваецца, у мінулым годзе прыйшоў у інтэрнат № 6 старшыня факультэцкага таварыства цвярозасці і аб'явіў, што «сёння днём інтэрнат № 6 ужо стаў зонай цвярозасці». Каб вывесці студэнтаў са стану крайняга здзіўлення і неяк згладзіць непрыемнае ўражанне, было сказана шмат прыгожых слоў аб неабходнасці, карысці такога рашэння, у чым ніхто і не сумняваўся. Але вырашаць гэта павінны ўсё ж самі студэнты.

Дапамога ім таксама гарантавалася. На жаль, усё гэта засталося толькі словамі. У падобных выпадках прынята вінаваціць студэнтаў. Нічога, маўляў, не робяць, а свае недахопы на іншых перакладваюць. Адна, здавалася б, нязначная дэталь: ні Галавач, ні Анелькін не змаглі назваць прозвішча старшыні таварыства цвярозасці, бо на іх патоку ён не выкладае.

Патрэбна паглядзець праўдзе ў вочы. Таварыствы цвярозасці растуць, як грыбы пасля дажджу. Уступаюць у іх па-рознаму: добраахвотна і абыякава-прымусова. Калі гнацца за колькасцю членаў таварыства, то можна запісаць і ўсіх п'яніц у цвярэзнікі, а потым праглядаць справаздачы і радавацца, як усё паспяхова, ружова.

Ці не стане студэнт у чаргу за бутэлькай віна перад паездкай дамоў на святы, адсуне прапанаваную чарку ў гасцях? Невядома. А як хочацца, каб было іменна так. У той частцы студэнтаў, што засталася сустракаць мінулы Новы год у інтэрнаце, можна быць упэўненымі. Інтэрнат не памятае нічога падобнага: астанавілася дыскатэка, замаўчаў магнітафон, і закружыўся вакол ёлкі вясёлы карагод з рускімі народнымі песнямі. А конкурсы на лепшае веданне частушак успаміналі не адзін тыдзень. Хто не верыў, што і без віна будзе весела, пераканаліся ў адваротным.

Справа гэта не аднаго месяца, нават не аднаго года: пераканаць людзей у тым, што жыць без алкаголю не толькі карысна для здароўя, але і весялей. Студсавету даводзіцца шмат працаваць, каб заваяваць давер рабят. З крыўдай гаварыў А. Анелькін, што жадалі людзям прыемнае зрабіць: папрасілі старастаў паверхаў сабраць звесткі, калі ў каго дзень нараджэння, каб павіншаваць кожнага. Але папаўзла чутка, што ў гэты дзень будуць хадзіць па пакоях, правяраць, ці няма дзе паху спіртнога. Рабяты пакрыўдзіліся, і звесткі сабраць не ўдалося. Так узнікла ўзаемная крыўда.

Але патрэбна адзначыць, што здаравей стала атмасфера ў інтэрнаце. Студэнты самі пачалі шукаць цікавыя формы правядзення адпачынку. Конкурсы «А ну-ка, дзяўчаты!», «А ну-ка, юнакі!», КВЗ — гэта ўсё ўжо стала звычайным. Існуе яшчэ шмат шляхоў выхавання ў студэнтаў нецярпімасці да спіртнога, прыхільнасці да здаровага ладу жыцця. Але пярвейшая ўмова — выгнаць з інтэрната сум, арганізаваць здаровы дасуг. І гэта студсавету ўдаецца.

Хаця яшчэ даводзіцца старшыні яго чуць: «Ну што такога: куплю бутэльку віна на дзень нараджэння сябра. У інтэрнаце ж не п'ю, раз нельга!». Але падобных разважанняў становіцца ўсё менш. Павольна, цяжка, але ўсё ж пачынаюць разумець людзі, што спіртное — не абавязковы атрыбут свята. І дапамагчы ім зразумець гэта якраз і закліканы таварыствы цвярозасці. У інтэрнаце № 6 усё закончылася тым, што жыхароў яго занеслі ў спісы і сабралі членскія ўзносы. Л. Галавач, А. Анелькін выказалі жаданне хаця б пазнаёміцца са старшынёй факультэцкага таварыства цвярозасці.

Віна са студсавета поўнасцю не здымаецца. Клопатаў у яго хапае, хаця прыняць нейкія меры па ажыўленню работы таварыства яны маглі. Але, як правіла, калі няма жадання працаваць у кіраўніцтва, то няма яго і ў падначаленых.

На савеце прафілактыкі універсітэта быў адзначаны ўзорны парадак у інтэрнаце, ніякіх «надзвычайных здарэнняў» не было. Гэта радуе, але і да многага абавязвае студсавет, усіх пражываючых у інтэрнаце.

Шмат ужо сказана пра шкоду п'янства, не сціхае напал дыскусій ў прэсе. І патрэбна пісаць і гаварыць пра гэта яшчэ і яшчэ, каб не ператварыць барацьбу з п'янствам у аднадзённую кампанію.

Таму, мне здаецца, самая лепшая прапаганда здаровага ладу жыцця — гэта плакат: «Запрашаем усіх на навагодні карнавал. Прыходзьце. Будзе вельмі цікава!»

І. РУСЕЦКАЯ.

# «ІНТЭГРАЛ»— «ІНТЭГРАЛУ»

ПЕРАБУДОВА ВНУ: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

**Перабудова патрабуе хутчэйшага выкарыстання ўсіх рэзерваў — матэрыяльных і інтэлектуальных — у справе паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця.**

АДНЫМ з недахопаў падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца неабходнасць «давядзення» выпускнікоў ВНУ да ўзроўню самастойнай працы. Адным са спосабаў скарачэння перыяду адаптацыі маладых спецыялістаў да задач сучаснай вытворчасці з'яўляецца далучэнне да вучэбнага працэсу вядучых супрацоўнікаў перадавых прадпрыемстваў, арганізацыя мэтавай падрыхтоўкі. Кафедра фізікі паўправаднікоў фізічнага факультэта, якая рыхтуе студэнтаў у межах вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна — вытворчае аб'яднанне «Інтэграл», ужо даўно перанесла на прадпрыемства частку вучэбнага працэсу. Шэраг спецкурсаў чытаюць супрацоўнікі аб'яднання. Там жа студэнты выконваюць лабараторныя, курсавыя і дыпломныя работы, праходзяць практыку.

Аднак вопыт работы ВНВА паказаў, што патрэбны новыя формы работы, якія дазваляюць студэнтам непасрэдна ўключыцца ў працэс вытворчасці, зразумець яго законы яшчэ ў перыяд вучобы, каб адразу пасля атрымання дыплома актыўна пачаць самастойную працу. З гэтай мэтай у пачатку 1986 года было вырашана стварыць па ўзору СБА атрад для працы на ВА «Інтэграл».

Хаця аналагічныя атрады ўжо існуюць у шэрагу ВНУ краіны, дагэтуль не было тыпавых палажэнняў. Кафедры і аддзелу тэхнічнага навучання аб'яднання прыйшлося самастойна распрацаваць і ўзгадніць дакументы ў неабходных інстанцыях раней, чым атрад змог прыступіць да працы.

Наш атрад з 14 чалавек, ён названы, як і аб'яднанне, «Інтэграл», працаваў у летні перыяд на вытворчым участку аднаго з цэхаў. Студэнты працавалі на асноўных аперацыях, абслугоўваючы разам з кадравымі рабочымі аўтаматычнае і паўаўтаматычнае абсталяванне. Трэба сказаць, што атрыманыя ва універсітэце веды і вопыт, дазволілі членам атрада хутка прызвычаіцца. Атрадам выкананы аб'ём работы, адпавядаючы вырабу таварнай прадукцыі на суму 691 тысяча рублёў. Заробак членаў атрада ў залежнасці ад асабістага ўкладу склаў ад 260 да 320 рублёў.

Члены атрада пазнаёміліся са структурай цэха, арганізацыяй працы, тэхналагічнымі працэсамі, умовамі аплаты ў гаспадарча-разліковых брыгадах. Яны ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці калектыву, рыхтавалі палітінфармацыі для рабочых. Атрадам праведзены Дзень ударнай працы, сродкі ад якога пералічаны ў Фонд Чарнобыля. Водгукі аб працы членаў атрада добрыя, але асобна адзначылі зменныя майстры працу камісара атрада Ірыны Будрэвіч і байцоў Юры Корабава, Людмілы Вайткевіч, Інесы Сабалеўскай.

Адміністрацыя ВА «Інтэграл», улічваючы паспяховую працу атрада, прапанавала зрабіць яго круглагадовым. Сёння каля 40 студэнтаў працуе ў вольны ад вучобы час.

Распрацаванае намі палажэнне аб атрадзе стала даступным і іншым факультэтам універсітэта. Аналагічныя атрады ствараюцца зараз на радыёфізічным, хімічным факультэтах, ФПМ.

Сёння маладыя супрацоўнікі кафедры заняты фарміраваннем дадатковага кола навукова-даследчых задач, якія можна вы-рашыць сіламі студэнтаў. Згодна палажэнню, да гэтай працы вырашана далучыць студэнтаў старэйшых курсаў. Членам атрада, студэнтам старэйшых курсаў, якія маюць здольнасць да вытворчай працы, рэкамендавана ў перыяд канікулаў і практыкі дазволіць працаваць майстрамі і тэхнолагамі.

Такім чынам, удзел у атрадзе карысны, нават калі ў будучым студэнты будуць працаваць не на ВА «Інтэграл», а ў НДІ, КБ ці на іншых прадпрыемствах. Яны атрымліваюць рабочыя прафесіі, вучацца цаніць працу рабочага, даведваюцца, што можна, а што нельга патрабаваць ад яго, сутыкаюцца з усімі аспектамі дзейнасці працоўнага калектыву «знутры», з'яўляючыся яго раўнапраўнымі членамі. Працуючы ў атрадзе на працягу некалькіх гадоў, студэнты наогул могуць высветліць і развіць свае схільнасці і здольнасці да характэрных для выторчасці відаў дзейнасці, і ў адпаведнасці з імі папрацаваць на старэйшых курсах на пасадах інжынераў, тэхнолагаў і майстроў. Гэта дазволіць ім набыць навыкі самастойнай канструктарскай працы, кіравання вытворчасцю і тэхналагічнымі працэсамі, працоўнымі калектывамі, што павінна садзейнічаць ранейшай адаптацыі маладых спецыялістаў да ўмоў будучай дзейнасці.

Праца ў круглагадовым навукова-вытворчым атрадзе значна адрозніваецца ад СБА. У СБА студэнты звязаны з прымаючай арганізацыяй толькі матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем. Там можна «прыхапіць» некалькі гадзін звыш нормы. Члены НВА уліваюцца ў сталы калектыў (участак, змену) з яго планам, працай у некалькі змен на кожным станку і дакладным рытмам, які патрабуе штодзённага выканання нормы за адведзены час.

Трэба падкрэсліць, што арганізацыя круглагадовых атрадаў патрабуе вялікіх намаганняў і ўвагі не толькі ад камітэта камсамола, але і кафедраў, дэканатаў і рэктарата. Напрыклад, у многіх студэнтаў, якія вучацца ў першую змену, лабараторныя заняткі — вечарам. Для працы ў атрадзе тут, як гаворыцца, ёсць жаданне, але няма магчымасцей. Дэканаты павінны пайсці насустрач студэнтам, якія працуюць вечарам, трэба толькі скласці спрыяльны расклад заняткаў.

Большасць студэнтаў ахоплена разнастайнымі відамі факультатыўных і грамадскіх работ, якія сталі дзякуючы умовам сацспаборніцтва абавязковымі. Гэта ВДПС, НДПС, навуковыя гурткі. Добра, калі ў гуртку ці на факультатыве студэнт вывучае нешта карыснае для будучай працы. Але калі ён даведаецца аб гэтым на вытворчасці — дрэнна не будзе. Членаў НВА можна смела вызваліць ад часткі такіх заняткаў, тым больш, што ўдзел у атрадзе з'яўляецца пастаянным камсамольскім даручэннем.

Гэта можа патрабаваць пэўнай пераарыентацыі працы кафедраў, бо мы не проста «аддаём» вольны час студэнтаў вытворчасці. Выкладчыкам неабходна сумесна з кіраўнікамі падраздзяленняў знайсці тэмы курсавых і дыпломных работ на «Інтэграле». Гэтыя тэмы павінны быць патрэбнымі прадпрыемству і непасрэдна звязанымі з працай студэнтаў у НВА. Кіраўнікам курсавых і дыпломных работ неабходна так арганізаваць працу студэнтаў, каб яны ўспрымалі вытворчы працэс як аб'ект для пастаяннага паляпшэння. А работы выконвалі на ўзроўні рацпрапаноў і вынаходніцтваў, паляпшаючы ўмовы працы і павышаючы прадукцыйнасць на сваіх і суседніх рабочых месцах.

Яшчэ адзін рэзерв часу, які можна выкарыстоўваць для працы на вытворчасці — ліквідацыя дэфіцыту вучэбнай літаратуры. Напрыклад, гэта — ратапрынтнае выданне канспектаў лекцый і інструкцый лабараторных работ. Для членаў атрада, якія паспяхова спалучаюць вучобу з вытворчай працай, належыць смялей уводзіць індывідуальныя формы навучання.

Атрад прыносіць бясспрэчную карысць і вытворчасці, асабліва цяпер, у момант перабудовы, пераходу на трохзменную працу.

П. ЖУКОЎСКІ,
камандзір КСНВА «Інтэграл»,
кандыдат фізіка-матэматычных навук.

ПЫТАННЕ РУБАМ

**Сёння наша размова пойдзе пра наглядна-агітацыйную работу. Наведаем для пачатку камітэт камсамола мехмата. І прафсаюзны, і камсамольскі работнік знойдзе тут неабходную для сябе інфармацыю. Тут жа вісіць стэнд, дзе змешчаны экран кантролю за выкананнем пастаноў камітэта камсамола, ёсць план рэалізацыі крытычных заўваг. Аб сваёй рабоце інфармуе і студэнцкае навуковае таварыства.**

# Студэнту ці правяраючаму?

ВЕЛЬМІ цікава на факультэце аформлены спартыўны стэнд. Аператыўна з'яўляюцца выпускі «КП», «Калючак». Радуе і тое, што выходзіць газета «Рошым любую задачу».

Шмат добрых слоў можна сказаць у адрас мехматаўцаў, але, на жаль, і тут ёсць недахопы. Усё яшчэ не завершана афармленне «Залы Перамогі», няма стэнда з інфармацыяй па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Ідзём на шосты паверх галоўнага корпуса, дзе займаецца гістфак. Хто ведае, можа і разлічвалі яны, што правяраючым не хопіць сіл і жадання сюды зазірнуць. Наглядная агітацыя на гэтым паверсе афармляецца вельмі марудна, «састарыліся» стэнды і на пятым паверсе.

Вам часам не даводзілася знаёміцца з факультэцкай газетай «Гісторык»? І мне таксама. А вось стэнд, на якім яна павінна вывешвацца, знаходзіцца ў непрыглядным стане. Застаецца ўражанне, што па невядомых прычынах «Гісторык» выходзіць не на аркушах паперы, а непасрэдна на гэтай дошцы: уся яна крэйдай спісана. У назве газеты нават літара адсутнічае. Мабыць, увага да друкаванага органа адышла ў гісторыю.

Камітэт камсамола гэтага факультэта, з году ў год змяняючы свой састаў, над змяненнем практычнай дзейнасці, напэўна, задумваецца не асабліва. Ды і навошта старацца, калі «Універсум» (орган камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў кафедраў грамадскіх навук БДУ) таксама «радуе» студэнтаў не спецыяльна падрыхтаваным выпускам. а аб'явай аб неабходнасці ў час здаваць камсамольскія ўзносы...

Інфармацыя камсамольскай арганізацыі фізфака наогул афармляецца да гэтага часу без асаблівага жадання. Усё яшчэ няма выпуску «КП». Фізікі правялі вялікую работу па афармленню свайго корпуса. Але, згадзіцеся, гэта ж не значыць, што мяняцца павінны толькі аб'явы, а стэндам вісець доўгія гады.

Ёсць чым пахваліцца факультэту прыкладной матэматыкі. Але на жаль, агульнае ўражанне аб нагляднай агітацыі жадае чакаць лепшага. На факультэце восем кафедраў. Кожная мае свой стэнд для інфармацыі, выпускае «КП». Гэта вельмі добра. Але ж бяда ў тым, што ўсе восем кафедраў размясцілі сваю інфармацыю у невялікім калідоры. Ад стракатых стэндаў аж вочы разбягаюцца.

Не вядзецца на факультэтах і аператыўнае інфармаванне аб актуальных падзеях палітычнага жыцця краіны. Хацелася б, каб камітэты камсамола надавалі ўвагу і інфармацыі пра інтэрработу. Прыкладам можа служыць пастаноўка гэтага пытання на фізічным факультэце.

Такім чынам, гаварыць пра тое, што хоць які з пералічаных факультэтаў вядзе наглядна-агітацыйную работу на належным узроўні, рана. Недахопаў яшчэ шмат. Але вопытам афармлення асобных стэндаў абмяняцца можна.

Хацелася б, каб новыя саставы камітэтаў камсамола пад кіраўніцтвам партбюро звярнулі ўвагу і на гэтае важнае пытанне. Усё ж гэта патрэбна студэнту, і павіннна рабіцца перш за ўсё для яго, а не для камісій.

В. КАЗЛОВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

# Пейзажы В. Караля

НАШ ФОТАКОНКУРС

*ДЗІЎНЫ ў чалавека лёс бывае: здараецца, так жыццёвы шлях паварочваецца, што і сам не чакаў, і іншыя, даведаўшыся аб тваім выбары, здзіўляюцца. Валера Кароль зрабіў свой першы здымак у час службы ў арміі, а ўжо праз год, адразу пасля звальнення, пачаў працаваць фотакарэспандэнтам у мастоўскай раённай газеце. Сёння ён — студэнт трэцяга курса факультэта журналістыкі.*

*Лекцыі, семінары, залікі і... фота. Фотаапарат стаў для Валеры рэччу першай неабходнасці. Бо з яго дапамогай можна зберагчы назаўсёды ўражанні ад Пскова, дзе дысклацыраваўся будатрад, ад заснежанага бацькі-Дняпра, праз які прыйшлося пераправіцца яго турыстычнай групе.*







# РУЖОВЫ РАНАК

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

## *Жанна Пахадня*

### ВОСЬ

*І я ў нейкім сэнсе вось,*
*Навярэджаная ў кругаверці;*
*І ў мяне сваё кола ёсць,*
*І качуся з ім. Па інерцыі.*

*Укалясілася — і імчу.*
*Маё кола мяне не пытае,*
*Хачу таго ці не хачу...*
*А чым я яго затрымаю?!*

*Гэта кола — штодзённых*
*турбот —*
*Прытарможваю ў маладосці*
*Спадзяваннем на паварот*
*Да ўзвышанага чагосьці...*

*Годзе ветру пустэльна выць!*
*Утаптаная іншымі роўнядзь:*
*Ні пагорка, каб перакаціць,*
*Ні выпадку, каб запомніць.*

*Што я ўбачу?*
*Сляды наўсцяж.*
*Азірнуся —*
*мае, пад пылам...*
*«Ты стамілася проста.*
*Прыляж!»*
*Легла...—*
*і крылы сасніла!..*

### УРОК МУЗЫКІ

І. — Ля, ля, ля...
— А трэба: соль, соль, соль!
— Соль, соль, соль...
— Фальшыва — ля-бемоль!

. . . . . . . . . . . .

ІІ. Думкам-гукам
неадчэпным
Белы ліст — клавіятурай:
Ні бемолем не зачэрніць,
Ні дыезам не схалтурыць.

Грыць высока. Граць
мажорна.
Граць без паўзы, нат як
раптам
Заіржаўленае горла
Папракне:
«Не ладзім з тактам!»

Не цягнуць з чужое ноты,
Бо загубішся ў аркестры;
Знаць, каторы ты і хто ты,
Для каго пяеш ты.

А глухі — дык што вініцца?
І цябе не ўчуюць:
Не ў кнігарнях на паліцах
Салаўі начуюць!

## *Алесь Бадак*

### РОСЫ

Ад смеху зоркі ледзьве
Не ўпалі на зямлю.
Калі рачулцы
Ведзьме
Шапнуў з нябёс
«Люблю»
Нясмела месяц бледны.
О, дай ты рады, свет!
Прызнацца
Ведзьме?!
Бедны!
Ды гэта ж... гэта ж... гэт...
І сыпаліся жарты
З нябёсаў
на вясну:
— Вось гэта густ —
вядзьмарку!
— Не страшна? Ну і ну!
— Чаго ж ты зараз варты!
Дзівак і дуралей.
І месяц бледнатвары
Пасунуўся далей.
Назаўтра сонца росы
Збірала ў травах зноў.
Салёныя, бы слёзы.
Гарачыя, бы кроў.

### МАЦІ

Старэнькая маці
Зарання прачнецца.
Уходзіцца спешна.
У горад збярэцца.
Яшчэ раз падлічыць
Бязважкія грошы.
Не скажа суседцы,
Куды і навошта.
І душны аўтобус
За вёскай запыніць.
У горад паедзе,
Паедзе па сына.
Вы ёй не кажыце
Пра грэх і законнасць.
Вы ёй не дакажаце
Сёння ўсёроўна.
Яна не паверыць
Ніводнаму слову.
Ёй трэба начальнік,
І самы галоўны.
Яна ўздыхне адно:
«Божа мой, божа!»
З сабой павязе
І надзею і грошы.
І будзе дарогай
Паціху маліцца
Да самай, да самай
Раённай міліцыі.

## *Сяргей Чыгрын*

* * *

Бутэрброды і кампліменты
Любяць студэнты,
Песні і танцы,
У каханні прызнацца,
Жыць, чакаць, спадзявацца.
Любяць студэнты
Працоўнае лета:
Калі старацца —
Спорыцца праца.
Іх інтэрнаты
Усім багаты:
Тут бутэрброды
І кампліменты,
І спевакі тут,
І паэты...
Бо без гэтага мы
Ці студэнты?..

## *Наталля Кучмель*

* * *

*Хай знікну. Застанецца глеба,*
*І клён, і птушка між галля.*
*Бывай, не дадзеная небам,*
*Але абраная зямля.*

*Я не памру. Не захлынуся*
*Пакутай вышняй, незямной,*
*А, стомленая, адыдуся,*
*Прыкрыўшы дзверы ў свой*
*пакой.*

*І каб ніхто з жалобай вострай*
*Не бег услед шукаць мяне —*
*Вас папрашу, браты і сёстры:*
*Вы абдыміцеся мацней.*



## *Славамір Адамовіч*

* * *

Слухай, спяваюць тутэйшую песню.
У ёй пра дзяўчыну, пра холад крыніц,
пра маладога русявага цеслю
з вуснамі колеру спелых суніц.

Слухай, спяваюць пра воўчае лыка,
што красавіцкімі днямі цвіце.
Гукі плывуць і над краем нязвыклым
радасць вятрыска шляхамі нясе.

Слухай, спяваюць дзяўчаты Палесся.
Плёхаюць словы ў хвалі Дняпра,
Сожам плывуць альбо крочаць узлессем.
Толькі да людства бліжэй, да жытла.

Слухай, спяваюць! Так вольна і шчасна
толькі ў маёй Беларусі пяюць.
Там, дзе Гародня. Карма і дзе Краснае,
там, дзе мае крывічане жывуць.

Тамсама усё квітнее вішня й бэз,
і гордыя асверы крэсляць неба.
Там богавым аблокам не паспець
ад воч людскіх схаваць запрэжку Феба.

Тамсама ўсё жархучая трава,
і шэры чмель, і пыл, і скрып атосы.
І ровар, нахілёны да слупа,
і я бягу, расхрыстаны і босы.

О вобразы крывіцкія, о свет
і любасць над усім без атачэння.
Як хутка ападае белы цвет
і як марудна спее плод праменны.

## Вечар памяці

*ВЯЛІКАЯ ЗАЛА філалагічнага факультэта сабрала ў сваіх сценах вялікую граматду. І адразу адышлі развагі: ці прыйдуць людзі, ці збярэцца некалькі чалавек.*

*Вечар памяці Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча пачаўся расказам пра нашага паэта. Успаміналі яго сябры — Адам Мальдзіс, Генадзь Кісялёў, Валянцін Ждановіч. І здавалася, што партрэт на завесе — так толькі, а хутка ў залу зойдзе ён і ўсміхнецца, што сабралася багата моладзі, якую так любіў, што тут пяюць песні хлопцы і прыгожыя дзяўчаты, паказваюць слайды, на якіх адбіта бацькаўшчына, яе прыроднае хараство і працалюбівыя сыны, дочкі, іх цудоўныя вырабы.*

*Нашчадкі чыталі свае вершы і тое, што напісаў Уладзімір Сямёнавіч, гучалі пранікнёныя вершы пра Беларусь.*

*Выканаўца Алесь Камоцкі чула праспяваў песні, якія прыдумаў сам, і было зразумела, што і так званая «самадзейная» песня гучыць міла, лірычна, гарэзліва.*

*Плылі са сцэны мелодыі палескіх нізін, пушчаў і бязбрэжных лугоў. Доўга дзякавалі апладысментамі ўсе за гэты вечар, бо гарачы дух выканаўцаў перадаўся прысутным і выклікаў шчыры, пранікнёны водгук ва ўсіх.*

*А. ТАРАС.*

## *Зміцер Саўко*

# НАРАДА

ГУМАРЭСКА

СТАРШЫНЯ вытворчага аб'яднання па выпрабу паэзіі, прозы і іншай літаратурнай прадукцыі (ВЫППІЛІП) тав. ЦС 999 Ш гаварыў змястоўна, а галоўнае — сцісла:

— Шаноўныя хаўрусн... э-э... таварышы! Скончылася эпоха, калі мастацкае слова знаходзілася ў безадказных руках людзей. А што ёсць чалавек?! Чалавек ёсць недасканалая фізіялагічная сістэма, асаблівасці функцыяніравання якой не дазваляюць, па-першае, сапраўды прадукцыйна працаваць. Па-другое, вытворчы працэс, што ажыццяўляецца гэтай сістэмай, па-сутнасці немагчыма кантраляваць. Сёння на змену такому хібнаму стварэнню, як чалавек, прыйшоў літаратар-робат, літаратар-камп'ютэр. І вось канк...

На працягу усёй старшынёвай прамовы у цэху быў чуцен пранізлівы свіст, які штохвілю ўзрастаў у моцы.

— Таварыш ХР 100 С, годзе храпці, вы не ў сваім працоўным боксе,— перапыніўшы прамову, заўважыў старшыня і ціхенька загуў.

Жарт быў ацэнены — старшынёў смех дружна падхапілі, у тым ліку і вінаваты. Казалі, што ён перапісвае апавяданні, аповесці, а часам і раманы са старых кніг, замяняючы толькі імёны на індэксы і нумары. Але гэта мала каго турбавала, хіба што чытачоў. Галоўнае — ён выконваў план.

— ... рэтныя вынікі,— працягваў старшыня справаздачу,— вынікі, якімі можа ганарыцца кожны камп'ютэр-пісьменнік. Усяго нашым ВЫППІЛІПам за мінулы год было створана 32.792,3 твора, што складае 103,4 працэнта да плана! Шаноўныя хаўруснікі... гэта, як яго... калегі! Гэта вялікі поспех нашага прадпрыемства, калектыў якога змагаецца за прысваенне...

Голас старшыні станавіўся усё цішэйшы і цішэйшы, словы — усё менш разборлівымі. Таварыш САМ 000 Г своечасова падкаціўся да шэфа, пераключыў ягоны блок электрасілкавання на рэжым акумуляцыі, дагодліва заправіў тав. ЦС 999 Ш уласнай энергіяй і з годнасцю вярнуўся на месца.

Праз колькі секунд старшыня ачуняў:

— Дзякую! — Ён павярнуўся да тав. САМ 000 Г.— Сёння мы маем магчымасць павіншаваць нашага вядомага паэта, усімі паважанага таварыша САМ 000 Г з новым працоўным поспехам: выходам у свет ягонага 176-га зборніка вершаў.

Вядомы паэт сарамліва задрыжаў паказальнікамі індыкатараў.

— Адзін з вершаў апошняга зборніка хачу вам прадэманстраваць. На экраннай панелі з'явілася наступнае:

ПЕРШАЯ СУСТРЭЧА

У незабыўны для блок-памяці мамэнт
Цябе зафіксаваў мой фотаэлемент...

— Настойліва раю пагадзіцца з наступнай ацэнкай: цудоўна, выдатна, непараўнальна...— На гэтым слове таварыш старшыня прыпыніўся.— Праўда, тэма сустрэчы з камп'ютэрыхай у наш час... Адным словам, вершык нічога.

— На маю асабістую думку, гэта вялікаяткі лухта,— асмеліўся заўважыць ПЗ 090 У з цэха крытыкі.

— А вам, грамадзянін ПЗ 090 У, варта было б памаўчаць. Ваша ўпартае нежаданне выконваць план, абыякавасць да захавання дысцыпліны...— таварыш старшыня пагрозліва заміргаў лямпачкамі.— Ваша асабістая думка! Га! Вы бачылі?! Ягоная асабістая думка! Вы не лічыце патрэбным прымаць да ўвагі ацэнку, якую даў вышэй памянёнаму твору ўвесь наш дружны згуртаваны калектыў, чый аўтарытэт прызнаны ва ўсім камп'ютэрным свеце!!!

— Я... я...— спрабаваў абараніцца ПЗ 090 У.

— Змоўч!.. Дарэчы, замест таго, каб выдаваць прадукцыю на перфакартках, як гэта патрабуе Інструкцыя, ты наўмеўся пісаць пяром на паперы! — ад неўтаймоўнага абурэння металічны корпус робата чацвёртага пакалення ЦС 999 Ш стаў полымна-чырвоным.— Такім, як ты, няма месца ў літаратурнай вытворчась-сь-сь-сь...

Па-над таварышам старшынёй завіўся шызаваты дымок...

— Перапаліўся трансфарматар,— шэптам канстатаваў нехта ў няўтульнай цішыні.

— Га, канец старому калуну! — заварушылася купка на далёкім краі стала.

— Хлопцы, сёння філонім! — весела зашумеў сход.

— Усім заставацца на месцах! — выгукнуў тав. САМ 000 Г і яшчэ шпарчэй за папярэдні раз выкаціўся да старшынёўскага месца (нябожчыка ЦС 999 Ш ужо адцягнулі ў кут).— Нарада працягваецца.

## *Станіслаў Атамановіч*

### АСЕННІ ШЛЯХ

Ноч асенняя. Скуголе
Па-звярынаму вятруга.
У пустым на зіму голлі
Сее дожджык-пацяруха.
Сумна, холадна, маркотна
Ў пуцявіне чалавеку.
Галаву схіліў гаротна,
Нешта свішча на палетак.

Ноч — хоць выкаліце вока,
Змрок ахутаў наваколле.
Як ісці яшчэ далёка —
Хоць ты сам завый у полі.

* * *

Ну нарэшце, ну нарэшце
Закружылі белым роем
Серабрыстыя іскрынкі!
Засцілаючы сцяжынкі,
У паветры між сабою
Нешта шэпчуць, нешта
шэпчуць...

Раскідае, раскідае,
Усё гусцей лажыцца снег.
Без супынку, да задышша
Трусіць дзесьці на гарышчы
Дзед Мароз свой стары
мех —
Вытрасае, вытрасае...


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
11 снежня 1986 года
АТ 07705 Зак. 1523.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.